сущности оборотнических верований, сосредоточены в первую очередь на поиске их источника. Всё, что касается их бытования в последующие эпохи, имеющиеся теории, строго говоря, не рассматривают, объявляя всё, что прямо или косвенно относится к этой теме, последствиями, пережитками или искажениями «найденного» исходного представления. Однако вопрос генезиса оборотнических верований не тождественен ни вопросу их существования в более поздние времена, ни вопросу об оборотнических представлениях как части традиционной культуры.

Религиозно-мифологические представления являются неотъемлемой частью жизни общества и, в значительной степени, определяются им. Поэтому, с нашей точки зрения, необходимо разделить темы происхождения обротничества, его существования в архаическом социуме и его существования на время фиксации этнографических материалов (изучение современных оборотнических представлений является отдельной темой и здесь не рассматривается). Это позволит нам избежать необходимости обращения к концепции «пережитков».

Также, на наш взгляд, уместно использовать понятие «механизм оборотнических превращений», которое описывало бы сущностную, корневую часть оборотнических верований в любой точке времени и в любой культуре. С нашей точки зрения, во всякой религиозно-мифологической системе имеются некоторые представления, которые можно рассматривать как фундаментальные – они описывают структуру космоса, ожидаемые результаты взаимодействий различных сил, типовые характеристики действующих персонажей и т. д. Вера в оборотничество не может быть отнесена к числу фундаментальных, поскольку рассказы о превращениях человека в животное скорее основываются на других верованиях, чем создают и определяют их. Соответственно, для оборотнических представлений в каждой культуре в любой момент времени должны существовать верования, выступающие по отношению к ним в качестве фундамента.

Под «механизмом оборотнических превращений» мы будем понимать в дальнейшем а) фундаментальные представления, присущие той или иной культуре, которые делают оборотничество возможным в глазах её носителей, а также б) комплексы основанных на этих фундаментальных представлениях действий, приводящих непосредственно к превращению. Это даст возможность выявить специфику оборотнических представлений в отдельные исторические периоды и для отдельных культур.

**Список литературы:**

1. Нолл, Р. Вампиры, оборотни, демоны в психиатрической литературе XX века / Р. Нолл. – Киев : Факт, 1999. – 250 с.
2. Соколова, З. П. Животные в религиях / З. П. Соколова. – М. : Лань, 1998. – 288 с.
3. Токарев, С. А. Ранние формы религии / С. А. Токарев. – М. : Политиздат, 1990. – 622 с.

***Ульяна Жылко***

## ПЕРААСЭНСАВАННЕ МАТЫВУ «ЗАКЛЯТАГА БАГАЦЦЯ» Ў КАЗЦЫ ДЖ.ТОЛКІНА «ХОБІТ, АБО ВАНДРОЎКА ТУДЫ І НАЗАД»

*У артыкуле разглядаюцца адметнасці пераасэнсавання фальклорнага матыву «заклятага скарбу» ў аповесці-казцы Дж.Толкіна «Хобіт, або Вандроўка туды і назад». Акцэнт робіцца на разглядзе лёсу рэчаў заклятага скарбу і лёсу ўладароў заклятага багацця. Падкрэсліваецца амбівалентнасць у сімвалічнай трактоўцы матыву.*

***Uliana Zhilko***

## *RETHINKING «ARCH – RICHES» MOTIVE IN J.R.R. TOLKIN'S FAIRY TALE «THE HOBBIT, OR THERE AND BACK AGAIN»*

*The article discusses some variants of rethinking the folk motive «accursed treasures» in J.R.R. Tolkin's fairy tale «The Hobbit, or There and Back Again». The emphasis is on the on considering the fate of things of the cursed treasures and the fate of the lords of the cursed riches. The author emphasizes the ambivalence in the symbolic interpretation of the motive.*

Вусная народная творчасць выступае шырокай прасторай для навуковых пошукаў. Цікавасць ўяўляе сюжэтаўтваральны матыў так званых «заклятых скарбаў», пошукі і авалоданне якімі, па народных уяўленнях, звязвалі з дзеяннем магічных рытуалаў, якія засцерагалі рэчы ад знаходжання чужымі людзьмі. Паколькі фальклор ва ўсе часы з'яўляецца крыніцай матываў для аўтараў арыгінальных літаратурных твораў, то літаратуры розных перыядаў і эпох змяшчаюць дастатковую колькасць прыкладаў пераасэнсавання названага матыву, пачынаючы ад сярэднявечнага эпасу, які арыентаваўся на вусную славеснасць як на перашакрыніцу, і заканчваючы новай літаратурай, для якой у значнай ступені характэрны ўстойлівы ўплыў рамантычнай традыцыі.

Адным з яскравых прыкладаў пераасэнсавання дадзенага матыву ў англійскай літаратуры з'яўляецца аповесць-казка Дж. Толкіна «Хобіт, або Вандроўка туды і назад». Пісьменнік абапіраўся на кельцкі, скандынаўскі і германскі фальклор. Сюжэт казкі заснаваны на найбольш папулярных матывах народных чарадзейных казак: золата і каштоўнасці выступаюць рухальнай сілай і першапрычынай ўсіх гісторый, звадак і сутыкненняў. Нягледзячы на відавочную аўтарскую апрацоўку, фальклорны матыў «заклятага багацця» пры аўтарскім пераасэнсаванні захаваў традыцыйную аснову. Неабходна выявіць адметнасці лёсу саміх каштоўнасцей і лёсу скарбашукальнікаў, а таксама разгледзець сам працэс дасягнення пастаўленай мэты, звязанай з пошукамі і авалоданнем скарбам.

Спачатку трэба прыгадаць гісторыю багацця гномаў: дзякуючы прыроднай працавітасці і ўпартасці, падчас раскопак Гары гномы знайшлі шмат каштоўных камянёў і золата і ў выніку неверагодна разбагацелі. Гэта прывяло да ўзнікнення своеасаблівай ідыліі, «залатога часу»: «Увогуле, той час быў для нас добры. Самыя бедныя з нас мелі грошы, каб пазычаць і траціць, і вольны час, каб рабіць цудоўныя рэчы проста дзеля свайго задавальнення [2, с. 42]». Па меркаванні даследчыка творчасці пісьменніка Н. Баналя, каштоўнасці рознага кшталту, напрыклад, упрыгожванне з чыстага золата становіцца носьбітам і выразнікам першароднай сілы, якая зыходзіць з зямных недраў. Такім чынам, упрыгожванні і каштоўныя камяні, якія амаль што ва ўсіх міфах і легендах звязаны з цмокам або змеем, заключаюць у сабе сімвал



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

бессмяротнасці [1, с. 243]. Згодна англійскай фальклорнай традыцыі, на якую арыентаваўся Дж. Толкін, у ролі разбуральнай сілы выступае цмок: «Цмокі крадуць золата і каштоўныя камяні, вы ведаеце, і ў людзей, і ў эльфаў, і ў гномаў – наагул, паўсюль, дзе толькі знойдуць, і пільнуюць ўсё жыццё (фактычна, вечна, калі іх не заб'юць), і ніколі не выкарыстаюць і меднага пярсцёнка [2, с. 45]».

У казцы Дж. Толкіна скарб гномаў паўстае амбівалетным – з аднаго боку, ён з'яўляецца сімвалам дабрабыту і бесклапотнага ідэальнага жыцця, і ў той жа момант золата служыць асноўнай прычынай усіх няшчасцяў. Трагічны лёс напаткаў рабаўніка-цмока, якога можна лічыць чарговым уладаром скарбаў пасля гномаў-здабывальнікаў: ён быў забіты трапнай стралой Баліна. Хобіт Більба Торбінс (Бэгінс) першапачаткова прадстае перад чытачом гультаяватым абывацелем, які, аднак, прайшоўшы праз усе выпрабаванні, змяняецца ўнутрана, становіцца мудрым, высакародным. Напрыканцы аповесці Більба выдатна ўсведамляе марнасць і бессэнсоўнасць той бітвы паміж эльфамі і гномамі, што пачалася праз золата і каштоўны камень Аркенстон, і прывяла да незлічоных стратаў. Менавіта таму хобіт адмаўляецца ад сваёй долі каштоўнасцей, якую прапаноўвае яму Бард: «Аднак я нават рады пазбавіцца ад узнагароды. Крый нябёсы, як мне давезці тыя скарбы без забойстваў ды вайны па дарозе? Я не ведаю. І што я буду рабіць з імі дома? Я ўпэўнены, лепей ім застацца тут, у вашых руках [2, с. 251]». Але адмаўляецца не цалкам, бо, як у любой казачнай гісторыі, станоўчы герой павінен быць узнагароджаны за перанесеныя выпрабаванні і цяжкасці падчас прыгод, таму Більба «згадзіўся ўзяць толькі дзве невялікія скрыні, адну з золатам, другую са срэбрам, такія, што здольныя везці здаровыя поні».

Маштабы сілы ўздзеяння заклятага багацця на герояў яскрава прасочваюцца праз вобраз Торына Дубатарча, які лічыўся пераемнікам каралеўскай улады Пад Гарой. Гномы былі надзвычай няўстойлівымі перад «цмокавай хваробай» (маецца на ўвазе прага да багацця і каштоўнасцей – У.Ж.), таму маглі хутка страціць здольнасць валодаць сабой: «…калі сэрца гнома, нават найбольш паважанага ды паважнага, раздражніць золатам ды самацветамі, ён робіцца дзёрзкім і лёгка можа зрабіцца шалёным [2, с. 207]». Авалодаўшы каштоўнасцямі і не маючы магчымасці забраць іх з сабою, яны карысталіся спрадвечным спосабам захавання скарбу: закопвалі багацце ў зямлю. Гэты момант у аўтарскай казцы з'яўляецца відавочным перайманнем традыцыйнага матыву «закляцця» скарбу дзеля збережэння золата на працяглы час: «Потым прывялі поні, адвезлі золата і добра схавалі яго непадалёк ад шляху каля ракі, яшчэ і пачараваўшы над сховішчам на выпадак, калі з'явіцца магчымасць сюды вярнуцца [2, с. 44]». Дадзеная цытата добра адлюстроўвае супадзенне аўтарскага апісання аднаго з варыянтаў месца, дзе традыцыйна, згодна многім фальклорным творам, закопвалі багацце – недалёка ад дарогі, а таксама сам рытуал схавання золата ў мэтах захавання пры дапамозе чароўнага закляцця.

Аднак вернемся да вобразу Караля Пад Гарой. Першапачаткова Торын паўстае перад чытачом як мужны ваяр і мудры кіраўнік, але, тым не менш, ім кіруе прага авалодаць таямнічым камнем Аркенстонам. З'яўляючыся Сэрцам Гары (своеасаблівым абярэгам ідэальнай прасторы і гарманічнага жыцця на ёй), а адначасова і сэрцам самога Торына, Аркенстон – краевугольны камень, Грааль, які захоўвае таямніцы светастварэння. Да таго ж Торын, асліплены вернутым золатам гномаў, быў абыякавым да чужога няшчасця, якое напаткала жыхароў спаленых Дракам гарадоў, нягледзячы на тое, што людзі аказвалі гномам дапамогу ў змаганні з цмокам. Цалкам прадказальным у гэтым рэчышчы з'яўляецца далейшы лёс Торына, – ён гіне у бойцы за скарбы, але адметным з'яўляецца яшчэ той момант, што перад смерцю ён, зразумеўшы сваю асноўную памылку, пакаяўся ў здзейсненым: «Там, куды я іду зараз, няма патрэбы ў золаце і кляйнотах. Я пакідаю іх тут. Я хачу ўзяць назад усе свае словы, якія казаў тады, каля Брамы. І ўчынкі таксама. <…> Калі б большасць з нас шанавала добрую ежу, смех ды песні вышэй ад золата, прыемней было б на свеце [2, с. 248–249]».

Такім чынам, праз апісанне лёсу ўладара Пад Гарой і змены яго светапогляду найперш адлюстроўваецца мараль літаратурнай казкі, згодна з якой багацце не можа прынесці шчасця таму, хто не здольны адмовіцца ад яго, праявіўшы міласэрнасць да абдзеленых і пакрыўджаных. У гэтым заключаецца асноўная розніца паміж Більба, які, адмовіўшыся ад золата, вяртаецца дадому з больш каштоўным набыткам у выглядзе вопыту і незабыўных уражанняў ад прыгод, і Торынам, які, выконваючы сваю «родавую» функцыю ў захаванні багацця племені гномаў, ледзь не прывёў сілы дабра да паразы перад злом.

Само багацце, якое стала асноўнай крыніцай міжусобных звадаў паміж гномамі, эльфамі і людзьмі, у выніку было справядліва падзелена паміж усімі, хто меў у ім патрэбу. Большая яго частка дасталася жыхарам Азёрнага горада, дзякуючы чаму яны адбудавалі спалены Дракам горад, які неўзабаве расквітнеў і ўмацаваўся. Аддаўшы перавагу сілам дабрыні, Дж.Толкін, тым не менш, не ідэалізуе казачны свет. Ён падкрэслівае наяўнасць і ў некаторай ступені неўміручасць зла ў свеце. У асноўным зло гэта існуе за кошт чалавечай слабасці перад спакусамі, звязанымі з прагай да багацця. з гэтай нагоды аўтар уводзіць, на першы погляд, неістотны, але ў той жа момант значны паварот у сюжэце, звязаны з адлюстраваннем далейшага лёсу гарадскога Бурмістра: «А вось стары Бурмістр скончыў дрэнна. Бард даў яму шмат золата, каб той дапамог людзям з возера, але ж Бурмістр быў таго чалавечага кшталту, што звычай лёгка чапляе цмокавую хваробу. Вось і захварэў на яе і збег у Пустэчу, прыхапіўшы большасць золата, а там памёр з голаду, пакінуўшы прыспешнікам [2, с. 262]».

Такім чынам, фальклорны матыў «заклятага багацця» і яго пошукаў з'яўляецца ключавым у аўтарскай казцы Дж. Толкіна «Хобіт, або Вандроўка туды і назад». Абапіраючыся на традыцыі германскага і скандынаўскага фальклору, аўтар выдатна адлюстроўвае амбівалентнасць у сімвалічным успрыманні багацця. Скарбы гномаў, з аднаго боку, выступаюць сімвалам бесклапотнага жыцця ў дастатку на ідэальнай прасторы Пад Гарой. З другога – з'яўляюцца асноўнай прычынай бессэнсоўных войнаў і шматлікіх нявінных ахвяраў сярод людзей, эльфаў і гномаў. Такая палярнасць яскрава прасочваецца і ў лёсе саміх скарбаў, апісаных у казцы. Багацце гномаў не з'яўляючыся заклятым, трапіўшы ў рукі мудрых уладароў, прыносіць шмат карысці і дабра: ідзе на аднаўленне разбураных цмокам гарадоў, дапамагае Більба ў гаспадарчых патрэбах. Традыцыйная палярнасць прасочваецца і ў апісанні лёсу часовых уладароў багацця: Більба, выстаяўшы супраць спакусы, вяртаецца ў свой мірны гарадок, дзе жыве шчасліва, Драк разлічыўся за сваю «залатую хваробу» жыццём, а гном Торын, праявіўшы абыякавасць да чужой бяды праз сляпую хцівасць, гіне, хоць і ўсведамляе сваю асноўную памылку.

**Спіс літаратуры:**


1. Бонналь, Н. Толкиен. Мир чудотворца / Н. Бонналь. – М. : София: «Гелиос», 2003. – 377 с.
2. Толкін, Дж. Р. Р. Хобіт, або вандроўка туды і назад / Дж. Р. Р. Толкін. – Мінск : Нефармальнае творчае аб'яднанне «ТТТ», 2002. – 256 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ